# З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ, КАМСАМОЛ!

**Няхай жыве Ленінскі камсамол — надзейны памочнік і баявы рэзерв Камуністычнай партыі, перадавы атрад маладых будаўнікоў камунізму!**

(З Заклікаў ЦК КПСС).

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 28 (1178) ● 29 кастрычніка 1977 г. Цана 2 кап.

## Са святам, дарагія сябры!

**Адзінаццацітысячная армія камсамольцаў нашага універсітэта разам з усім савецкім народам і прагрэсіўнай моладдзю свету адзначае дзень нараджэння камсамола.**

**Рэктарат, партыйны камітэт, мясцком, прафесары і выкладчыкі бачаць у камсамольцах сваіх паўсядзённых памочнікаў у барацьбе за трывалыя і глыбокія веды студэнтаў, у падрыхтоўцы ідэйна загартаваных і высокакваліфікаваных спецыялістаў. Камсамол нашага ардэнаноснага універсітэта выхаваў нямала вядомых у рэспубліцы і ва ўсёй краіне вучоных, партыйных і грамадскіх дзеячаў, пісьменнікаў, паэтаў, настаўнікаў. Цяпер ён разам з рэктаратам, партыйнай і прафсаюзнай арганізацыямі паспяхова здзяйсняе пастановы і ўказанні ЦК КПСС па далейшаму развіццю вышэйшай адукацыі ў краіне, паляпшэнню выхаваўчай работы сярод моладзі.**

**Сардэчна віншуем вас, члены Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі, з днём нараджэння камсамола і жадаем новых выдатных поспехаў у вучобе, глыбокага авалодання марксісцка-ленінскай тэорыяй, спецыяльнымі дысцыплінамі, у выкананні велічнай праграмы выхавання падрастаючага пакалення.**

**Будзьце дастойны працоўнай і баявой славы бацькоў!**

**РЭКТАРАТ
ПАРТКОМ
МЯСЦКОМ.**

Напярэдадні знамянальнай даты ў гісторыі нашай Радзімы і ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва — 60-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі — мы рапартуем Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Генеральнаму сакратару ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварышу Леаніду Ільічу Брэжневу, што камсамольская арганізацыя Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, якая налічвае ў сваіх радах адзінаццаць тысяч членаў ВЛКСМ, стаўшы на юбілейную кастрычніцкую вахту, дабілася новых поспехаў у павышэнні працоўнай і грамадска-палітычнай актыўнасці студэнтаў, авалоданні глыбокімі і трывалымі ведамі, выхаванні ў будучых спецыялістаў камуністычнай перакананасці, свядомай дысцыпліны, любві да сваёй прафесіі.

Для нас, камсамольцаў універсітэта, які носіць імя вялікага Леніна, няма нічога больш узвышанага і высакароднага, чым кіравацца запаветамі геніяльнага правадыра сацыялістычнай рэвалюцыі, самааддана змагацца за справу, якой ён прысвяціў усё сваё жыццё. Галоўную сваю задачу мы бачым у тым, каб не толькі выдатна вучыцца, але і актыўна дапамагаць партыйнай арганізацыі, прафесарска-выкладчыцкаму саставу ў навучанні і выхаванні спецыялістаў высокай кваліфікацыі.

У цэнтры ўвагі камсамольскай арганізацыі пастаянна знаходзіцца вучоба кожнага студэнта. Сёння мы рады далажыць, што ва універсітэце 1206 выдатнікаў вучобы, 17 імянных стыпендыятаў, 4213 чалавек займаюцца на добра і выдатна. Толькі па выніках 1976-77 навучальнага года 486 студэнтаў узнагароджаны значком ЦК ВЛКСМ і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР «За выдатную вучобу».

З кожным годам шырацца гарызонты студэнцкай навукі. У навукова-даследчай рабоце ў цяперашні час удзельнічаюць 7300 студэнтаў, паспяхова працуюць

# РАПАРТ

### камсамольскай арганізацыі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна ЦК КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка.

7 студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый, 1665 студэнтаў распрацоўваюць гасдагаворныя тэмы.

У сучасных умовах важным сродкам камуністычнага выхавання з'яўляецца грамадска-палітычная практыка студэнтаў. Камсамольцы універсітэта актыўна ўдзельнічаюць у жыцці універсітэцкай, раённай, абласной і рэспубліканскай камсамольскіх арганізацый. 99,9 працэнта студэнтаў нашай ВНУ атэставана па выніках грамадска-палітычнай практыкі ў 1977 годзе.

Уключыўшыся ва Усесаюзны агітпаход студэнтаў, камсамольцы вядуць вялікую агітацыйна-прапагандысцкую работу. У мінулым навучальным годзе імі прачытана для працоўных і школьнікаў 9912 лекцый. Кожны камсамолец — удзельнік Усесаюзнага Ленінскага заліку «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!» — актыўна працуе над выкананнем асабістага комплекснага плана «Вучымся камунізму, будуем камунізм!»

Ударнай справай нашай арганізацыі стала шэфская работа ў школах і домакіраўніцтвах. Звыш 2 тысяч студэнтаў Белдзяржуніверсітэта шэфствуюць над 19 сельскімі, 9 гарадскімі школамі, 12 домакіраўніцтвамі, 7 гарадскімі прафтэхвучылішчамі г. Мінска.

Школу трэцяга працоўнага семестра ў 1977 годзе прайшлі 2098 студэнтаў. На будоўлях Беларусі, БАМа, Нечарназем'я, Малдавіі, Карэльскай АССР яны асвоілі 5,5 мільёна рублёў капіталаўкладанняў. Рукамі байцоў зводнага будаўнічага атрада універсітэта ўзведзена 19 жылых дамоў, 17 жывёлагадоўчых ферм, 11 школ і іншых аб'ектаў вытворчага і культурна-бытавога прызначэння. Атраднымі лектарамі прачытана 820 лекцый, агітбрыгадамі дано 587 канцэртаў, 3820 экземпляраў кніг перадалі сельскім бібліятэкам студэнты-будаўнікі БДУ.

У перыяд зімовых канікулаў 1976-77 навучальнага года на будаўнічых пляцоўках горада-героя Мінска працавалі два зімовыя будаўнічыя атрады: імя 60-годдзя Вялікага Кастрычніка і СБА імя акадэміка І. В. Курчатава.

Штогод студэнты універсітэта аказваюць вялікую дапамогу працаўнікам сельскай гаспадаркі ва ўборцы ўраджаю. Гэтай восенню ў сельгасработах прыняло ўдзел звыш 6 тысяч чалавек.

Вялікая ўвага ў рабоце камсамольскай арганізацыі ўдзяляецца ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнтаў. Маршрутамі рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа прайшлі 98 «зоркавых» атрадаў універсітэта. 105 імён выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны — устаноўлены групай «Доўг». Сіламі студэнтаў збудаваны Памятны знак выкладчыкам і студэнтам, загінуўшым у баях за Радзіму.

За дасягненне высокіх паказчыкаў ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, якасці работы і паспяховае выкананне народнагаспадарчага плана за 1976 год Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна прызнан пераможцай сярод ВНУ краіны і ўзнагароджан пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ.

Ад імя усіх камсамольцаў універсітэта мы запэўніваем Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Палітбюро ЦК КПСС на чале з таварышам Леанідам Ільічом Брэжневым, што прыкладзём усе намаганні для таго, каб кожны дзень дзесятай пяцігодкі стаў днём выдатнай вучобы, ударнай працы, высокай грамадска-палітычнай актыўнасці.

Рапарт падпісалі 456 чалавек.

## Яны паставілі свае подпісы ў Рапарце камсамольскай арганізацыі БДУ імя У. І. Леніна ЦК КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка



**Людміла Валюк,** студэнтка V курса гістарычнага факультэта, ленінскі стыпендыят.



**Аляксандр Уліцёнак,** студэнт III курса факультэта журналістыкі, выдатнік вучобы, староста акадэмічнай групы.



**Аляксандр Шыбут,** студэнт V курса мехмата, намеснік сакратара камітэта камсамола факультэта па арганізацыйнай рабоце.



**Міхаіл Пастухоў,** студэнт III курса юрфака, выдатнік вучобы, удзельнік двух працоўных семестраў.



**Яўген Макарэвіч,** аспірант кафедры неарганічнай хіміі, член камсамольскага бюро кафедры.

**Вараб'еў, В. П.** Навуку робім самі / В. П. Вараб'еў // Беларускі універсітэт. - 1977. - 29 кастрычніка. - С. 2.



# Гарачае прывітанне ўдзельнікам XXVII справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі універсітэта!

## ДАСЯГНУТАЕ — НЕ МЯЖА

Шматтысячная камсамольская арганізацыя універсітэта першай у рэспубліцы адгукнулася на заклік партыі ісці ў школы, вучылішчы, двары выхоўваць падрастаючую змену. З першых дзён шэфства стала ўдарнай справай студэнтаў, ганаровым абавязкам кожнага юнака і дзяўчыны. Аб тым, што гэта сапраўды так, сведчаць лаканічныя радкі лічбаў па выніках мінулага вучэбнага года. У 19 сельскіх і 9 гарадскіх школах, 7 прафтэхвучылішчах і 13 піянерскіх і дзіцячых пакоях працавала больш трох тысяч студэнтаў, кожны трэці камсамолец меў пастаяннае даручэнне, звязанае з шэфскай работай.

Неабходна адзначыць, што побач з традыцыйнымі формамі работы з падшэфнымі, такімі, як гутаркі, экскурсіі, лекцыі, канцэрты, паявіліся і новыя: зорныя паходы з наведваннем сельскіх школ, вядзенне заняткаў з адстаючымі ў вучылішчах. Студэнты хімічнага факультэта (адказная за шэфскую работу Т. Зеляneўская) сумесна з ГПТВ-38 арганізавалі выстаўку насценнага друку. Выдатную магчымасць практычнага прымянення сваіх ведаў, камсамольскага вопыту прадаставіў камітэт камсамола гэтага ж факультэта лепшым сваім актывістам, якія прымалі Ленінскі залік у падшэфных групах вучылішча. Плённыя ўзаемаадносіны ўстанавіліся таксама са сваімі шэфамі ў студэнтаў фізічнага, юрыдычнага факультэтаў, якія з агеньчыкам, з усёй сур'ёзнасцю адносяцца да даручанага. Сапраўднымі маякамі ў шэфскай рабоце, яе «заканадаўцамі» выступаюць філалагічны і гістарычны факультэты. Клуб філолагаў «Сэрца аддаю дзецям» стаў сапраўдным метадычным і практычным цэнтрам усёй шэфскай работы студэнтаў, выдатным узорам у рабоце з дзецьмі. Іменна тут нарадзілася ідэя стварэння перспектыўных планаў работы з падшэфнымі арганізацыямі, заключэнне доўгатэрміновых дагавораў з сельскімі школамі.

Ініцыятыўна працаваў у мінулым годзе шэфскі сектар гістарычнага факультэта, які ўзначальвае Валянціна Трушко. Па прапанове гісторыкаў вясной быў праведзен першы сярод шэфаў мінскіх ВНУ агляд-конкурс дзіцячых пакояў, лепшых калектываў мастацкай самадзейнасці. На фоне добрых спраў дрэнна выглядае шэфская работа факультэта журналістыкі. Камітэт камсамола журфака ні разу не прарэагаваў на неаднаразовыя нараканні бюро камітэта камсамола БДУ на слабую пастаноўку шэфства, на безініцыятыўнасць і халатнасць адказнай за шэфскую работу факультэта Алены Малочка, якая за ўвесь год толькі 2 разы знайшла час наведаць пасяджэнні савета шэфскага сектара БДУ. Зразумела, што і ў цэлым выніку на факультэце больш чым дрэнныя.

«Кожнай студэнцкай групе — падшэфны клас»—з такім дэвізам звярнуліся ў год святкавання 60-годдзя Вялікага Кастрычніка студэнты механіка-матэматычнага факультэта да ўсіх камсамольцаў універсітэта. Радасна канстатаваць, што на сённяшні дзень на факультэтах амаль усе акадэмічныя групы маюць шэфскія заданні.

Шэфская работа — нялёгкая, пачэсная і карысная. Іменна тут студэнты атрымліваюць першыя навыкі самастойнай работы са сваімі будучымі вучнямі, бліжэй знаёмяцца з будучымі патрабаваннямі і, магчыма, цяжкасцямі.

Той, хто па-сапраўднаму рыхтуецца да заўтрашняй сваёй работы, правярае свае магчымасці сёння. Прыемна назваць у ліку лепшых універсітэцкіх шэфаў Люду Юрчык з гістарычнага факультэта, Веру Харанека, Анатоля Макрацова (фізічны), Яніну Кавальчук, Людмілу Івашкевіч (хімфак), Яўгена Цімафеева, Люду Язерскую (юрфак), Люду Андрэеву (філфак), Ірыну Амельчанка (біяфак), Наташу Лобач (ФПМ) і многіх іншых.

Сёння мы можам рапартаваць камсамольскай канферэнцыі, што шэфская работа і надалей будзе развівацца і ўдасканальвацца, што нашы шэфы-студэнты не пашкадуюць сіл і энергіі ў імя высакароднай мэты — выхавання маладога пакалення сапраўднымі барацьбітамі за мір і шчасце.

**М. ПРЫГОДЗІЧ,**
**член бюро камітэта камсамола.**

## НАВУКУ РОБІМ САМІ

Біёграфы дваццатага стагоддзя, называючы яго векам атама і космасу, генетыкі і інфармацыі, усё часцей адзначаюць яго прыкмету — павышэнне творчай актыўнасці моладзі ў навуцы. І гэта не даніна часу або модзе, а аб'ектыўная заканамернасць.

Зойдзем у адну з лабараторый універсітэта, якая належыць кафедры радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі. Студэнты пад кіраўніцтвам старшага навуковага супрацоўніка А. М. Кавалеўскай распрацоўваюць навуковыя і тэхналагічныя асновы радыяцыйных метадаў ачысткі сцёкавых вод хімічнай прамысловасці. Тэма даследавання гучыць даволі складана. Але, заўважым, яна неаддзельная ад нашага сённяшняга жыцця, праблем аховы навакольнага асяроддзя. Ёсць і канкрэтны заказчык — вытворчае аб'яднанне «Палімер».

А вось іншая студэнцкая лабараторыя. Тэма работы — інфармацыйна-пошукавыя сістэмы аўтаматызаваных сістэм кіравання вытворчасцю швейнай фабрыкі ў Бабруйску, камбіната верхняга трыкатажу ў Пінску.

Не проста навукова-даследчая работа, а канкрэтнае, прадуманае дасягненне пастаўленай мэты з далейшай абавязковай перспектывай яго ўкаранення — вось той асноўны шлях, па якому зараз ідзе развіццё студэнцкай навукі ў нашым універсітэце. Прыкладны характар даследаванняў ніколькі не змяншае высокі тэарэтычны ўзровень тых або іншых распрацовак.

**Логікай лічбаў і фактаў:**

**За мінулы год студэнтамі універсітэта атрыманы 2 аўтарскія пасведчанні. 36 работ, у якіх прымалі ўдзел і студэнты, укаранёны або прыняты к укараненню. Аналізатар стану агрэгатаў авіяцыйнай тэхнікі, зроблены студэнтамі, дэманстраваўся на ВДНГ СССР. Ён узнагароджан бронзавым медалём выстаўкі. Распрацаваны метады і сродкі вібраакустычнага кантролю стану ротарных машын з эканамічным эфектам 900 тыс. рублёў у год. Ва універсітэце вядуцца даследаванні больш чым па 600 тэмах.**

Так, але ж студэнту, акрамя заняткаў навукай, і вучыцца трэба. Вядома, перш чым вызначыць навукова-даследчыя заданні, трэба выкраіць час для іх выканання. Студэнцкі дзень і так доўгі — шэсць гадзін лекцый і семінараў, не лічачы пазалекцыйнай самастойнай працы над падручнікам. Дзе ж знайсці не хвіліны, а месяцы для заняткаў навуковай працай?

У нашым універсітэце ўсе 17 спецыяльнасцей маюць вучэбныя планы са спецыяльна адведзеным часам на навукова-даследчую работу. У выкананні гэтых планаў вялікую ролю адыгрываюць студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі

Дзвесце трыццаць пяць з паловай тысяч рублёў — такі грашовы вынік выкананых студэнтамі гасдагаворных работ. А які эканамічны эфект атрымалі прадпрыемствы, укараніўшыя тыя ці іншыя распрацоўкі студэнтаў? Лічба значна большая за гэту. І калі некалькі гадоў назад было шмат спрэчак аб тым, ці варта ўключаць студэнтаў у выкананне гасдагаворных работ, то зараз гэтае пытанне залішняе. Студэнты справай даказалі, што ім па плячу такая работа. Дарэчы, і ружы каханай дзяўчыне прыемней дарыць, калі яны куплены за свае грошы.

**Логікай лічбаў і фактаў:**

**Студэнты ўдзельнічалі ў работах па колькаснай сушцы рэльефу тэрыторыі Беларускага Паазер'я; у работах па вывучэнню дзейнасці мясцовых Саветаў па кіраванню галінамі народнай гаспадаркі і культуры; у распрацоўцы апаратуры для вывучэння параметраў біясферы, а таксама палявой радыёметрыі атмасферных ападкаў з мэтай аховы і прагназіравання навакольнага асяроддзя, у складанні археалагічных карт Беларусі.**

Творчасць студэнтаў—рэальная дапамога ВНУ народнай гаспадарцы краіны ў выкананні планаў дзесятай пяцігодкі. Калі зайшла гаворка аб актывізацыі творчай думкі студэнтаў, намеснік старшыні савета па НДРС універсітэта Г. Н. Блінкоў сказаў:

— Самая характэрная прыкмета сучаснага развіцця студэнцкай навукі—калектыўнасць даследаванняў. Дух калектывізму стварае атмасферу, найбольш спрыяльную для пошуку і знаходак. Напрыклад, пад рэдакцыяй Ніла Гілевіча выйшла кніга песень, сааўтарамі якой сталі амаль 200 студэнтаў-філолагаў. Шырокі дыяпазон прыкладання сіл студэнтаў у нашым універсітэце. Яны ўсё актыўней выкарыстоўваюць маючыяся магчымасці для аказання дапамогі працоўным калектывам у рашэнні іх практычных задач.

**В. ВАРАБ'ЁЎ.**

## КАМІСАР

**Камсамольцы ФПМ на сваім справаздачна-выбарным сходзе зноў выбралі сваім важаком студэнта IV курса Васіля Гаруса. Наш расказ—аб адным леце, праведзеным ім у будатрадзе.**

У той год намнога слабей, чым чакалася, правялі працоўны семестр будатрады факультэта. І калі восенню семдзесят шостага Васіля Гаруса выбралі сакратаром камітэта камсамола ФПМ, ён у першую чаргу ўзяўся за падрыхтоўку СБА да наступнага лета.

За плячыма былі два гады камісарскай работы ў лінейным атрадзе. Васіль добра ведаў, што значыць для СБА умелы, гаспадарлівы камандзір, вопытны камісар, трывалы актыў. І ведаў, што лепшая вучоба — практыка.

У хуткім часе на ФПМ стварылі зімовы будаўнічы атрад імя 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. Прайшоўшы «курс навучання» ў час зімовых канікулаў, яго байцы павінны былі ўзначаліць летнія СБА факультэта. Камісарам атрада стаў Васіль Гарус.

...Летам гэтага года я атрымаў камандзіроўку ў Клецкі занальны СБА. У будынку райкома, дзе знаходзіўся штаб зоны, нікога не было, акрамя старога вартаўніка. Зразумела, нядзеля.

— Мусіць, адпачываюць рабяты? — спытаўся я.

— Дзе там! —махнуў рукой дзед. — Усё ездзяць. Камандзіроўкі... Ды ты пачакай: камісар павінен вечарам прыйсці. Заўсёды да поўначы сядзіць, піша.

Сапраўды, пад вечар камісар прыехаў. Гэта быў ён, Васіль. Калі настаў час здаваць экзамены трэцяга семестра, камсамольскі сакратар паехаў са «сваімі» хлопцамі (большасць Клецкай зоны складалі універсітэцкія, у тым ліку з ФПМ, атрады). Працягваў справу, пачатую ў падрыхтоўчы перыяд: дапамагаў рабятам авалодаць няпростай будатрадаўскай навукай.

Лепшым у зоне па грамадска-палітычнай і культурна-масавай рабоце быў СБА «Волаты». Васіль вырашыў: няхай паглядзяць, павучацца і іншыя, як трэба ставіць канцэрты, чытаць лекцыі, афармляць наглядную агітацыю. Неўзабаве ўсе камісары лінейных атрадаў зоны з'ехаліся ў «Волаты» на семінар. Вучоба была арганізавана выдатна — аб цікавай, насычанай праграме семінара пісалі потым газеты.

...Неяк давялося Васілю ехаць у Мінск — дакладваць у абласным штабе аб рабоце. Мільгануў за акном аўтобуса ўказальнік «Нясвіж» — і паплылі купалы храма, старажытныя сцены, адлюстраваныя ў ружовай вадзе засынаючага возера... Вось бы рабят прывезці!







**НА ЗДЫМКАХ:**

Лабараторныя заняткі па аналітычнай хіміі. Студэнт другога курса камсамолец **Г. Жаўнерка** (верхні здымак) і яго аднакурснікі **М. Макун** і **В. Сарокін** у лабараторыі.

Фота **В. ДРАЧОВА.**

# Школа працы, школа выхавання

Неад'емнай часткай працоўнага выхавання ў ВНУ з'яўляецца студэнцкі працоўны рух. Толькі ў дзевятай пяцігодцы ў нас ва універсітэце школу працоўных семестраў прайшлі 10600 чалавек. За 5 год імі асвоена 21,4 млн. рублёў капіталаўкладанняў, здадзена ў эксплуатацыю больш 400 аб'ектаў культурна-бытавога і вытворчага прызначэння. Была праведзена значная грамадска-палітычная работа: дадзена 2166 канцэртаў, перададзена сельскім школам і бібліятэкам 11816 экземпляраў кніг, адрамантавана 129 сельскіх школ, пабудавана 116 спортпляцовак.

Сумесна з партыйным камітэтам камітэт камсамола праводзіць вялікую работу па падбору і падрыхтоўцы камандзіраў і камісараў лінейных атрадаў. З году ў год паляпшаецца састаў кіруючых кадраў СБА. Так, калі ў 1975 годзе са 134 кіраўнікоў занальных і лінейных СБА 40 працэнтаў з'яўляліся камуністамі, то ў гэтым годзе іх працэнт склаў 45.

Адсутнасць выпадкаў грубых парушэнняў тэхнікі бяспекі, устава СБА, унутрыатраднай дысцыпліны — вынік мэтанакіраванай і якаснай работы па камплектаванню і падрыхтоўцы атрадаў і дзейснага кантролю за іх работай з боку рэктарата, парткома і камітэта камсамола.

Толькі на будоўлях працоўнага лета 1976 года байцы універсітэта асвоілі 5,1 млн. рублёў капіталаўкладанняў. Упершыню ў мінулым годзе студэнты БДУ выязджалі на будаўніцтва Байкала-Амурскай магістралі. Атрад імя Ленінскага камсамола, працуючы ў раёне станцыі Беркакіт, выканаў аб'ём работ на 178 тыс. рублёў, даў для будаўнікоў БАМа 19 паўтарагадзінных канцэртаў, падарыў пасёлку Сярэбраны Бор бібліятэку ў 1000 кніг.

Па ініцыятыве камітэта камсамола на базе фізічнага факультэта быў сфарміраван атрад колькасцю 45 чалавек для работы ў раёне землетрасення ў Узбекскай ССР.

У трэцім працоўным семестры 1976 года прынялі ўдзел 18 выкладчыкаў універсітэта. «Пяцігодцы эфектыўнасці і якасці — энтузіязм і творчасць маладых» — пад такім дэвізам працавалі байцы СБА універсітэта ў першым годзе дзесятай пяцігодкі.

У падрыхтоўчым перыядзе 1977 года байцы зводнага СБА універсітэта правялі 207 суботнікаў і нядзельнікаў на прадпрыемствах і будоўлях горада-героя Мінска. Толькі на будаўніцтве Мінскага Палаца піянераў імі адпрацавана больш як 10000 чалавека-гадзін. Ініцыятыва студэнтаў універсітэта «Кожнаму байцу СБА адпрацаваць адзін дзень на будаўніцтве Рэспубліканскага Палаца піянераў» была падхоплена ўсімі гарадскімі будаўнічымі атрадамі. Лектары СБА прачыталі 392 лекцыі. У мэтах якаснай падрыхтоўкі агітбрыгад камітэт камсамола арганізаваў агляд-конкурс агітбрыгад СБА. Усяго да чэрвеня агіткалектывамі універсітэцкіх будатрадаў дадзена 318 канцэртаў. Разглядаючы шэфскую дапамогу як ударную справу камсамола ВНУ, камітэт ЛКСМБ сумесна з кафедрай педагогікі і аддзелам практыкі арганізаваў вучобу піянерважатых лагераў «Спадарожнік» па 12-гадзіннай праграме.

На юрыдычным і іншых факультэтах шырокае распаўсюджанне атрымала спаборніцтва паміж лінейнымі атрадамі за права насіць імёны студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны. У маі ў БДУ прайшоў першы злёт студэнцкіх будаўнічых атрадаў — пераможцаў сацспаборніцтва на факультэтах.

У трэцім працоўным семестры 1977 года 66 СБА агульнай колькасцю 2098 байцоў працавалі ў Мінску і Мінскай вобласці, на БАМе і ў Карэліі, у раёнах Нечарназем'я і Малдавіі. Яны асвоілі 5,5 млн. рублёў капіталаўкладанняў.

Студэнцкімі будаўнічымі атрадамі ў рабочым перыядзе праведзена вялікая грамадска-палітычная работа. Пры атрадах працавала 57 кансультацыйных пунктаў, 46 лагераў «Спадарожнік». Сотням сем'яў загінуўшых воінаў і партызан, ветэранаў працы дапамаглі студэнты — байцы СБА. 78 помнікаў і абеліскаў пабудавана, рэстаўрыравана і прыведзена ў парадак сіламі студэнцкіх атрадаў.

66 Герояў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, Герояў Працы, ветэранаў партыі і камсамола былі залічаны ганаровымі байцамі студэнцкіх будаўнічых атрадаў універсітэта.

У перыяд жатвы 1977 года атрады БДУ «Беларусія» і «Сучаснік» выступілі з ініцыятывай «Ураджаю юбілейнага года — увагу і клопат СБА», якая была адобрана ЦК ВЛКСМ і падхоплена ўсімі атрадамі рэспублікі. На палях калгасаў і саўгасаў студэнты універсітэта — байцы СБА адпрацавалі звыш 1000 чалавека-дзён.

Сакратарыятам ЦК ЛКСМБ быў адобран і прапанаван да распаўсюджання пачын камсамольцаў універсітэта «У юбілейным годзе кожнаму студэнту адпрацаваць на ўводных аб'ектах будаўніцтва ВНУ не менш 15 гадзін».

У перыяд работы ва ўсіх атрадах універсітэта прайшло абмеркаванне праекта Канстытуцыі СССР. Байцы горача адобрылі гэты выдатны дакумент нашага часу.

З заканчэннем працоўнага лета трэці семестр для многіх байцоў СБА не скончыўся: разам з усімі студэнтамі ВНУ яны выехалі на ўборку бульбы. З заклікам дапамагчы калгасам і саўгасам ва ўборцы ўраджаю выступілі ў гэтым годзе байцы СБА філалагічнага факультэта.

**А. КАЛІНКА.**

# З камсамольскім агеньчыкам

На біялагічным факультэце адбыўся справаздачна-выбарны камсамольскі сход. У змястоўным дакладзе сакратара камітэта камсамола факультэта Людмілы Перадрый глыбока прааналізавана дзейнасць камсамольскай арганізацыі за мінулы навучальны год. Адзначана, што студэнты факультэта дасягнулі значных поспехаў у вучобе — павялічылася колькасць выдатнікаў. Пранікнёна дакладчык гаварыла пра выдатнікаў Наталлю Няхайчык, Алену Прасвірніну, Таццяну Кечык, Святаслава Трыбуша, Пятра Арлова. Яны і многія іншыя студэнты з'яўляюцца не толькі ўзорам у вучобе, але і ў грамадскай дзейнасці. Ім, як лепшым, дадзена ганаровае права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола ЦК КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка.

Шмат увагі ў дакладзе адведзена правядзенню на факультэце Ленінскага заліку. Адзначана, што ён мабілізаваў камсамольцаў на добрыя справы. Напрыклад, штаб працоўных спраў, які ўзначальвае член бюро камуніст Міхаіл Мароз, праводзіў у час заліку суботнікі і працоўныя дэсанты. Двойчы камсамольцы працавалі на суботніку, прысвечаным Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў у Гаване.

На сходзе шмат гаварылася пра поспехі ў шэфскай працы, пра вытворча-азнаямленчую практыку, якую студэнты праходзілі ў ГДР і НРБ, пра зорныя паходы па мясцінах славы савецкага народа студэнтаў V курса 5-й групы, пра навуковую работу. Ва ўсіх выступленнях адчувалася камсамольскае гарэнне, зацікаўленасць кожнага студэнта факультэта ў дастойнай сустрэчы 60-годдзя Вялікага Кастрычніка.

Сход прыняў адпаведную пастанову і перадаў эстафету камсамольскіх спраў новаму саставу факультэцкага бюро.

**Н. КАРАБЦОВА,**
**студэнтка I курса журфака.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

Назаўтра ж пачаў «выбіваць» будатрадаўцам транспарт для экскурсій...

Па выніках працоўнага лета Клецкая зона стала першай ў вобласці, а будатрады ФПМ аказаліся ў ліку лепшых СБА універсітэта.

Хутка зноў лета, апранутае ў будатрадаўскую форменку, а пакуль што — іншыя клопаты. Трэба прадумаць план турысцкага паходу, прысвечанага юбілею Кастрычніка. Маршруты ўсіх груп скрыжуюцца ў Хатыні—там студэнты правядуць урачысты мітынг. Яшчэ пабываць у камсамольскай арганізацыі трактарнага завода (у факультэта з прадпрыемствам добрыя сувязі), пагутарыць аб сустрэчы студэнтаў з працоўнай моладдзю. Паклапаціцца пра апаратуру для музычнага клуба «Красавік»: добрую справу задумалі рабяты, і дыскатэка іх карыстаецца на факультэце вялікай папулярнасцю. А пра тое, што не застаецца вольнага часу, зусім не шкадуеш.

Праца з людзьмі, праца для людзей... Калі яно прыйшло ўпершыню, пачуццё таго, што табе верацъ, што твая дапамога неабходна і ты можаш павесці іншых за сабой?.. Можа, тады, калі семнаццацігадовым хлопцам, не прайшоўшы па конкурсу ў ВНУ, пачаў выкладаць матэматыку хлопчыкам і дзяўчынкам сваёй вёскі? Ці, можа, пазней, калі застыла перад табой тваё аддзяленне — ружавашчокія стрыжаныя хлопцы... Або гарачым будатрадаўскім летам?

...Засінеў за вокнамі змрок. Час дадому.

— Хочаш, прачытаю табе вершы? — раптам пытае ён.

— Вядома.

У гулкай цішыні універсітэцкага калідора задуменна гучыць яго голас.

— Ты нідзе не друкаваў іх?

— Не.

— Нават у насценнай газеце?

— Што ты, — усміхаецца Васіль. — Усе лічаць мяне такім занятым, сур'ёзным чалавекам, што нават і думкі не дапускаюць...

Праз хвіліну — ужо іншым, заклапочаным тонам:

— Дарэчы, наконт газеты. Трэба нам на факультэце насценны друк паляпшаць. Добра было б арганізаваць у вас, на журфаку, вучобу членаў рэдкалегіі. І не толькі нашай — можна ва універсітэцкім маштабе.

Пачынаем абмяркоўваць гэтую думку. Васіль дастае блакнот, робіць занатоўкі, спрачаецца, удакладняе...

**А. КЛАСКОЎСКІ.**

# НАША ПРАЦА—РАДЗІМЕ!

**Студэнты універсітэта паспяхова працавалі на ўборцы ўраджаю юбілейнага года ў калгасах і саўгасах рэспублікі. Групы студэнтаў былі сфарміраваны па тыпу СБА. Кожны атрад меў свайго камандзіра і камісара. Атрады не толькі выконвалі сельскагаспадарчыя работы, але праводзілі і вялікую грамадска-палітычную работу — чыталі лекцыі, паказвалі канцэрты, арганізоўвалі спартыўныя мерапрыемствы і г. д.**

**Сваю працу і грамадскую актыўнасць студэнты БДУ прысвяцілі слаўнаму юбілею Айчыны — 60-годдзю Вялікага Кастрычніка.**

**У атрадах прайшло зацікаўленае абмеркаванне праекта новай Канстытуцыі СССР. Яно з'явілася магутным стымулам актыўнасці юнакоў і дзяўчат.**

**Цяпер, калі студэнты зноў селі за парты, можна падвесці вынікі сельскагаспадарчых работ.**

**Такім чынам, студэнтамі універсітэта за 28—29 дзён было фактычна выканана 142257 норма-дзён. Норма выпрацоўкі склала 100—130 працэнтаў.**

**Выканана работ па ўборцы бульбы на 43004,7 рублёў; у той жа час убрана гародніны 2934 тоны, выцераблен лён з плошчы 913 гектараў.**

**У вольны час студэнтамі прачытана перад мясцовым насельніцтвам 294 лекцыі, дадзена 183 канцэрты, працавала 93 «бюро добрых паслуг», афармлены 194 клубы і бібліятэкі, аказана шэфская дапамога 824 ветэранам вайны і працы, сем'ям загінуўшых і інвалідам, праведзена 54 вечары адпачынку з мясцовай моладдзю, устаноўлена шэфства над 105 сельскімі школамі.**

**Па выніках сельгасработ першае месца прысуджана атраду «Журналіст-77» (камандзір В. Бурдыка, камісар Т. Нечыпарук); другое месца — атраду «Солярис» ФПМ (камандзір В. Рэчыц, камісар Л. Дударчык) і трэцяе месца — атраду аддзялення філасофіі гістарычнага факультэта (камандзір Л. Юрчык, камісар Н. Кандрычын).**

**Студэнты універсітэта з гонарам выканалі свой абавязак — дапамаглі працаўнікам вёскі своечасова ўбраць з палёў ураджай, добрымі справамі падтрымалі на вышыні пачэснае званне савецкага студэнта.**

**РЭКТАРАТ**
**ПАРТКОМ**
**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА**
**ПРАФКОМ.**

# ВЕЧАР ДРУЖБЫ

**22 кастрычніка на філалагічным факультэце адбыўся вечар, прысвечаны савецка-германскай дружбе.**

7 кастрычніка нямецкі народ адзначыў 28-ю гадавіну з дня ўтварэння ГДР. А цяпер рыхтуецца адзначыць 60-годдзе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Іменна Кастрычніцкая рэвалюцыя, перамога сацыялізму ў нашай краіне стварыла неабходныя ўмовы для перамогі сацыялізму на нямецкай зямлі — гэта думка гучала ў выступленнях нямецкіх гасцей.

Выступаючыя адзначылі таксама, што супрацоўніцтва, узаемадапамога дзвюх краін маюць вялікае значэнне як для нямецкага, так і для савецкага народаў. Аб гэтым сведчыць і той факт, што пасля заключэння Дагавору ў 1975 годзе было падпісана 25 новых пагадненняў па розных галінах вытворчасці, навукі, культуры.

Цяпер каля 15000 вучоных дзвюх краін актыўна супрацоўнічаюць. Да 1980 года яны распрацуюць 800 навукова-тэхнічных тэм. Развіваюцца і ўнутрыгандлёвыя сувязі. Тавараабарот паміж ГДР і СССР склаў у гэтым годзе 6,4 мільярда рублёў. Савецкі Саюз з'яўляецца самым вялікім гандлёвым партнёрам ГДР.

Студэнт з ГДР М. Н. Цэрк у сваім выступленні на вечары падкрэсліў:

— Нямецкі народ самаадданна змагаецца за выкананне і перавыкананне народнагаспадарчых планаў і імкнецца адзначыць 60-годдзе Вялікага Кастрычніка ў духу Леніна, у духу прадаўжальнікаў ідэй Леніна на нямецкай зямлі — Эрнста Тэльмана, Вільгельма Піка, якія лічылі гістарычны юбілей повадам для канкрэтнай дзейнасці, накіраванай на дасягненне новых перамог рабочага класа.

Пасля ўрачыстай часткі вечара быў дадзен канцэрт. Студэнты з ГДР выконвалі песні, чыталі вершы. Будучыя філолагі адкрылі сваю праграму песняй «Дружба—Фройндшафт». Гэтую песню падхапілі ўсе прысутныя.

З добрым настроем пакідалі глядзельную залу нямецкія студэнты, студэнты з філфака і многія госці, якія прысутнічалі на вечары дружбы.

**А. МАРЧУК.**



СТОП КАДР. Фота В. ДРАЧОВА.



# УВАГА:

## створан карпункт «Студенческого меридиана»

**У адпаведнасці з пастановай сакратарыята ЦК ЛКСМ Беларусі і калегіі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР ад 4 жніўня 1977 года на базе Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна пры камітэце камсамола створан карэспандэнцкі пункт часопіса «Суденческий меридиан» па Беларусі.**

**Зацверджан састаў карпункта. У яго адрас пачалі паступаць першыя пісьмы з усіх канцоў нашай рэспублікі. Грамадскія карэспандэнты часопіса пішуць аб цікавых падзеях, фактах, эпізодах у сваіх навучальных установах. Для іх мэтанакіраванай работы па асвятленню шматграннай дзейнасці грамадскіх арганізацый ВНУ, вучэбнага працэсу, дасягненняў у навуцы карпунктам распрацавана памятка грамадскаму карэспандэнту часопіса.**

**Усё новае, цікавае павінна праз часопіс стаць набыткам студэнцтва краіны. Пытанні вучэбнай і навуковай работы, узаемаадносін студэнтаў і выкладчыкаў, уплыў калектыву групы на паспяховасць, формы праяўлення грамадска-палітычнай актыўнасці студэнтаў, новае ў студэнцкім доме-інтэрнаце, у будаўнічым руху — словам, усё, што акружае студэнта ў аўдыторыі і за яе межамі, трэба ўважліва аналізаваць і дасылаць у адрас карпункта.**

**Жыццядзейнасць «Студенческого меридиана» ў многім залежыць ад тваіх пісьмаў, студэнт.**

**Карпункт чакае ад цябе карэспандэнцый, артыкулаў, замалёвак, нарысаў, вершаў і апавяданняў.**

**П. БРОЎКА**

# З ЮНАЧЫХ ДЗЁН

**Тых дзён ход мужны і суровы**
**І пазабудзецца калі —**
**Як жыў наш горад павятовы,**
**Як маладыя мы жылі.**
**Было: у час вялікіх святаў**
**Мы дэманстрацыяй ішлі,**
**Хлопцы ў юнгштурмаўках, дзяўчаты,**
**Здаецца, з песняю раслі.**
**Ішоў па бруку цвёрда, горда**
**Камуністычны наш Саюз —**
**Пілсудскага крывую морду**
**Трымалі мы за доўгі вус.**
**Ну і, вядома, што нязменна**
**Быў і Дзянікін і Махно,**
**З праткнутым задам Чэмберлена**
**Насілі з імі заадно.**
**А «Блуза Сіняя» складала**
**Раёк на хуткую руку —**
**Ад іх нямала пападала**
**Папу, буржую, кулаку.**
**У грудзях быў запал бунтоўны,**
**Хоць марш давай — па усёй зямлі...**
**Мы не мыляліся ў асноўным,**
**Мы сэрцам з Леніным жылі.**

# Вынікі НДР студэнтаў

У першым годзе дзесятай пяцігодкі навуковымі доследамі займалася 7239 студэнтаў універсітэта. 2613 студэнтаў прынялі ўдзел у навукова-даследчай рабоце па грамадскіх навуках. Студэнты БДУ выконвалі дзяржбюджэтныя і гасдагаворныя работы, удзельнічалі ў навукова-даследчых гуртках, алімпіядах, выстаўках, вучылі будучых абітурыентаў у школах «юных» і на грамадскіх падрыхтоўчых курсах, выступалі з дакладамі і лекцыямі перад насельніцтвам і г. д.

535 курсавых і дыпломных работ выконваліся ў інтарэсах прамысловасці. 36 работ, удзел у якіх прымалі студэнты, укаранёны ці прыняты да ўкаранення ў вытворчасць.

853 студэнты апублікавалі ў друку вынікі НДР, выкананых самастойна або ў сааўтарстве з вучонымі.

Студэнты універсітэта актыўна ўдзельнічалі ў «Днях студэнтаў» Мінскай вобласці, прысвечаных XXV з'езду КПСС і 60-годдзю Вялікага Кастрычніка. 24 студэнты выступілі на студэнцкай навуковай канферэнцыі «Студэнцкая навука — Ленінскаму камсамолу».

З 7 па 19 красавіка ў БДУ была праведзена традыцыйная XXXIV студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 107-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. На ёй было прачытана 2238 дакладаў.

Праводзіліся творчыя сустрэчы з дзеячамі беларускай літаратуры і культуры, журналістамі і пісьменнікамі — Максімам Лужаніным, драматургам Андрэем Макаёнкам, скульптарам Заірам Азгурам і іншымі.

Усімі формамі НДР студэнтаў кіруюць савет па НДРС і навуковы студэнцкі савет. У гэтым годзе ва універсітэце распрацаваны і зацверджаны палажэнні аб саветах па НДРС БДУ і факультэта, СНДЛ БДУ і кафедры. У выдавецтве універсітэта выпушчана кніга В. Серады і М. Базылева «Пытанні навуковай творчасці студэнтаў».

За вялікую работу па арганізацыі НДРС Ганаровымі граматамі ЦК ЛКСМБ узнагароджаны дэкан фізічнага факультэта дацэнт І. П. Зяцькоў, дацэнт С. А. Мячкоўскі. За поспехі, дасягнутыя ў НДРС, навуковы студэнцкі савет і старшыня НСС гістарычнага факультэта ўзнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.

**Прэс-цэнтр камітэта камсамола.**

# Перамаглі першакурснікі




У нядзелю ў парку «Перамогі» быў праведзен агульнауніверсітэцкі крос, прысвечаны 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Разам з усімі факультэтамі актыўны ўдзел у кросе прынялі студэнты факультэта журналістыкі. Галоўнай сілай, безумоўна, быў першы курс. Удзел у кросе прынялі амаль усе студэнты-першакурснікі. Нават прыйшлі тыя, хто не быў допушчан па здароўю да спаборніцтваў.

У юнакоў асноўная барацьба разгарнулася паміж Мікалаем Касяком і Аляксеем Аляксеевым. Усю дыстанцыю яны лідзіравалі і амаль разам прыйшлі да фінішу. На адзін момант А. Аляксееў апярэдзіў свайго таварыша і выйграў гэты забег. Ён жа заняў першае месца на факультэце. Другое месца ў Мікалая Касяка, трэцяе—ва Уладзіміра Шыка.

Сярод дзяўчат першае месца заняла студэнтка першага курса журфака Марыя Дабжынская.

У сучасны момант спорткамітэт падводзіць вынікі кросу, выяўляе пераможцу ў агульнакамандным заліку. Якое ж месца зойме журфак? Гэта мы ўбачым праз некалькі дзён.

**А. ВЕРУШ.**

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС

Мінск, універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 04479. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Заказ № 1682